Аўторак, 22 Снежань 2020

Віктара Стукава аштрафавалі за сцяг на балконе. Актывіст правёў трое сутак у ІЧУ

Друкаваць (/news/sud/item/3836-za-stsyag-na-balkone?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=3aa47ce5998344da5fdbfd58e2f1c50b9504b7c8)

Ацаніць гэты матэрыял (3 галасоў)



(/media/k2/items/cache/021b3b3a5beb310d3b0206779a143ee3_XL.jpg)

Сцяг на балконе Стукава ў Полацку

У судзе Полацку і Полацкага раёну 21 снежня на 270 рублёў аштрафавалі прафсаюзнага лідара Віктара Стукава – за тое, што размясціў «палотнішча бел-чырвона-белага колеру» на балконе. Мужчыну затрымалі 17 снежня і пратрымалі ў ІЧУ 72 гадзіны, абвінаваціўшы ў правядзенні адзіночнага пікетавання (ч.1 арт. 23.34 КаАП).

Пастанову аб пакаранні штрафам на 10 базавых велічынь вынес суддзя **Віктар Баліка**. Ён палічыў, што **Віктар Стукаў** сапраўды ўчыніў правапарушэнне, вывесіўшы, як запісана ў пастанове, каляровае палотнішча *«з мэтай публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў»*.

Стукаў сваёй віны не прызнаў: *«Юрыдычна я нічога не парушыў, вывесіўшы палотнішча для прасушкі на вяроўкі балкона. Больш за тое! Калі прыняць версію суду, што гэткім чынам я выказваў нейкія свае погляды – дык тады атрымліваецца, што гэта чыноўнікі міліцыі і суду парушылі маё права на свабоднае выказванне свайго меркавання, што гарантуе мне арт. 33 Канстытуцыі».*

Але больш за ўсё Віктара Стукава абурыла яго адвольнае затрыманне на трое сутак. Палачаніна затрымалі проста на пешаходным пераходзе – на той падставе, што ён калісьці і дзесьці пераходзіў дарогу ў неўстаноўленым месцы. Аднак у Полацкім РАУСе маёр міліцыі Ігар Емяльянаў склаў на Стукава пратакол паводле арт. 23.34 – за «незаконны пікет на балконе».

«Як мне сказалі ў міліцыі, рашэнне аб размяшчэнні мяне ў ІЧУ да суду прыняў дзяжурны па РАУСе, хоць у гэтым не было ніякай неабходнасці, бо я мог проста з'явіцца ў суд па позве. Я папярэдзіў дзяжурнага, што ён такім чынам перашкодзіць дзейнасці прафсаюзу. У мяне былі набытыя на пятніцу 18 снежня электронныя квіткі да Менску і назад для ўдзелу ў пасяджэнні Рады Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ)», – расказаў Віктар Стукаў.

З ягоных слоў, ён ужо накіраваў адпаведную заяву ў пракуратуру – з просьбай аб правядзенні праверкі па факце парушэння прававых нормаў заканадаўства службовымі асобамі Полацкага РАУС.

Наконт умоваў утрымання ў ізалятары Віктар Стукаў канстатуе прагрэс у параўнанні з тым, што назіралася ў ІЧУ ў 2017-м годзе. Пасля шматлікіх скаргаў у 2018 годзе там правялі капітальны рамонт. Стукаў расказвае, што камеру №1 пашырылі, цяпер яна на 8 чалавек, стаяць двух'ярусныя ложкі, з'явілася рукамыйніца, часам у ёй ёсць нават цёплая вада, з'явілася кабінка з дзверцамі ў прыбіральні. У камеры, па словах Віктара, стала цяплей. Харчаванне прывозяць з гарадской сталовай, часам яго недастаткова, але перыядычна даюць кіпень.

«Трэба патрабаваць, каб у камерах часцей праводзілі сур'ёзную санітарную апрацоўку, бо туды часта прыносяць блох і вошай. Некаторыя людзі выходзяць з ІЧУ моцна пакусанымі, звяртаюцца пасля гэтага ў спецыялізаваны дыспансер», - падсумоўвае Віктар Стукаў.

Аляксандр Марозаў

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: Віктар Стукаў (/itemlist/tag/Віктар%20Стукаў) Полацак (/itemlist/tag/Полацак) ІЧУ (/itemlist/tag/ІЧУ) бел–чырвона–белы сьцяг (/itemlist/tag/бел–чырвона–белы%20сьцяг) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП) Віктар Баліка (/itemlist/tag/Віктар%20Баліка)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Справу ліцэісткі Марыі Амасовіч спынілі. Суддзя папрасіў у яе прабачэння (/news/sud/item/3835-spravu-amasovich-spynili) Выняла з рамкі партрэт Лукашэнкі і напісала «3%» - жанчыну аштрафавалі на 216 рублёў » (/news/sud/item/3837-vynyala-z-ramki-partret-lukashenki)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3836-za-stsyag-na-balkone#startOfPageId3836)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/